


# СПОВЕДЗЬ ПЕРАД ЧЫТАЧОМ

**У мінскім кніжным выдавецтве «Белпринт» пабачыў свет новы зборнік айчыннай паэзіі. Яго аўтар член Саюза пісьменнікаў Беларусі, гродзенская паэтка Вольга Алізар. А называецца кніга вершаў – «Карункі жыцця».**

Змест зборніка складаюць вершы на беларускай мове, а таксама графічныя ілюстрацыі, якія выканала дачка пэтэсы Валерыя. У анатацыі да выдання гаворыцца: «”Карункі жыцця” – гэта не проста зборнік твораў, а свайго роду сповед аўтара перад чытачом. Тут усё: і любоў да Радзімы, і любоў да бацькоў, і любоў да сям’і, і захапленне наўколлем, і павага да мінулага. Аўтар нібыта прыадчыняе дзверы ў мінулае сваіх бацькоў і сваё асабістае і дазваляе чытачу дакрануцца вачыма да ўсіх тых падзей, дзякуючы якім сфарміравалася асоба аўтара. Аўтар спадзяецца, што творы знойдуць водгук у сэрцах чытачоў і стануць заклікам да таго, што трэба памятаць і шанаваць кожнага з продкаў, кожны з дзён, кожную са сцяжынак, якімі мы праходзім складаны шлях пад назвай ”Жыццё”».

Кампазіцыйна паэтка пабудавала змест свайго новага зборніка з трох раздзелаў:«У кожнага свой рай»; «Я частка сям’і»; «Памяць патрэбна жывым». «Карункі жыцця» – чацвёртае па ліку літаратурна-мастацкае выданне ў бібліяграфіі Вольгі Алізар.

На тыльным баку вокладкі новай кнігі размяшчаюцца творчая біяграфія і каляровы фотапартрэт паэткі. Тыраж 200 экзэмпляраў. Пераплёт мяккі. Рэдактар Таццяна Цвірко.

Першая прэзентацыя чарговай кнігі вершаў Вольгі Алізар «Карункі жыцця» адбылася на Фестывалі кнігі і прэсы ў межах XXXIII Дня беларускага пісьменства ў Касцюковічах (Магілёўская вобласць). У хуткім часе новае выданне гродзенскай паэткі з’явіцца ў бібліятэках.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**